# ЮЗЯФОЎКА ПАМЯТАЕ...







ВЁСКА Юзяфоўка месціцца абапал асфальтавага бальшака Хоцімск — Батаева і асабліва нічым не прываблівае: па правым баку, у нізіне (адно толькі дахі выглядаюць), цягнецца стары пасёлак. Па левым — новая вуліца, якая будавалася ў 1960—1970-х гадах і назва якой — Маладзёжная. Нядаўна на Маладзёжнай адбылася падзея, якая закранула амаль кожнага сённяшняга жыхара Юзяфоўкі: тут пасадзілі яблынева-грушавы сад у гонар аднавяскоўцаў — семдзесят тры саджанцы, што сімвалізуюць маладых вясковых хлопцаў, якія не вярнуліся з вайны. Кожнае дрэўца ў гэтым садзе імяннае, побач з саджанцам усталявана шыльдачка з прозвішчам і імем. Сённяшнія жыхары вёскі — а іх засталося зусім няшмат — вядома, ганарацца незвычайнай падзеяй. У большасці ўсе яны ніколі не бачылі сваіх родных — дзядоў, дзядзькаў, іншых сваякоў і суседзяў, бо нарадзіліся пасля вайны. Памяць пра іх жыла і жыве ў фатаграфіях, якія ў рамачках вісяць амаль у кожнай хаце.

У сужэнцаў Міхаіла і Зоі МАКАРАНКАЎ (фота справа) родныя таксама загінулі на фронце. Дзякуючы захаваным партрэтам, яны і ведаюць сваіх мужных продкаў. Іван Драздоў, дзед Зоі, загінуў на рацэ Проні пад Чавусамі ў 1943-м, а дзядзька Міхаіла, Васіль Макаранка, — пад Варшавай. У маладым садзе ў іх гонар пасаджаны два дрэўцы.

Адзіны сведка, які бачыў, як праводзілі на вайну юзяфоўскіх хлопцаў, — Іван Пешкін, якому сёлета пайшоў дзевяносты год. Іван Фёдаравіч на свае вочы бачыў, як абдымаліся з сынамі, братамі і бацькамі іх маці, сёстры, жонкі, праводзячы на фронт. І як галасілі, атрымаўшы пахаванкі. Памяць у Івана Фёдаравіча моцная, учэпістая, найстарэйшы жыхар вёскі ведае сапраўдную цану Перамогі, якую заплаціла яго Юзяфоўка, аддаўшы столькі маладых душ...

Іван Фёдаравіч, калі працаваў у калгаснай будаўнічай брыгадзе, зрабіў помнік-абеліск у гонар загінулых аднавяскоўцаў: сціплы абеліск і сёння стаіць пры дарозе.

У праекта «Сад Перамогі» таксама ёсць свой заснавальнік — унук былых франтавікоў — жыхароў Юзяфоўкі Аляксандр Ракоўскі. Даўно няма на свеце дзеда і бабы, а памяць пра вёску, у якую кожнае лета ён прыязджаў на вакацыі, жыла. Нягледзячы на тое, што жыве ён у Мінскай вобласці, здолеў арганізаваць пасадку яблынь і груш. У высакароднай справе яму дапамагалі мясцовая ўлада і школьнікі. На кожнай шыльдачцы напісаны дэвіз праекта: «У імя кахання, вечнасці і жыцця».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Хоцімскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак тэмы на 1-й стар.)*

# Профільныя, працоўныя, школьныя і загарадныя

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Лета ў школьнікаў будзе насычана спартыўнымі, забаўляльнымі, пазнавальнымі мерапрыемствамі. Хлопцы і дзяўчаты таксама ўключацца ў рэспубліканскія акцыі, у прыватнасці, у традыцыйны праект па прапагандзе здаровага спосабу жыцця і адмовы ад шкодных звычак «Ваш выбар!», — адзначыла Ганна Рысявец.

Сумесна з БДПУ не першы год у Мінску рэалізоўваецца праект «Дзеці сталіцы». У яго рамках студэнтамі-валанцёрамі будзе арганізавана занятасць дзяцей на базе сямі навучальных устаноў у пяці раёнах сталіцы. Студэнты займаюцца арганізацыяй свабоднага часу дзяцей і падлеткаў, якія не маюць магчымасці аздаравіцца летам у загарадных лагерах або наведваць школьны лагер. Валанцёры самастойна прыцягваюць дзяцей у праект: у мікрараёнах і на прышкольных пляцоўках расказваюць пра яго дзецям і іх бацькам, запрашаюць далучыцца. Дарэчы, адбор студэнтаў у праект адбываецца на конкурснай аснове.

## ПРЫЧЫНЫ ТРАГІЧНЫХ НАСТУПСТВАЎ

Міністэрства ўнутраных спраў правядзе летам творчыя і прафілактычныя мерапрыемствы для дзяцей і бацькоў, сярод іх будуць велаэстафеты, віктарыны і алімпіяды.

«Асаблівую ўвагу мы аддаём правядзенню прафілактычных мерапрыемстваў з бацькамі, — паведаміў **старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела па арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх МУС Васіль ДЗЕМІДОВІЧ.** — Міліцыянеры наведаюць працоўныя калектывы, растлумачаць дарослым прычыны і наступствы ДТЗ з удзелам дзяцей, нагадаюць аб правілах бяспечнай перавозкі непаўналетніх, адказнасці за парушэнні правілаў дарожнага руху, а таксама неабходнасці асабістага прыкладу правільных і бяспечных паводзін на дарогах».

Паводле яго слоў, самыя распаўсюджаныя парушэнні, якія здзяйсняюць дзеці і падлеткі, — гэта пераход праезнай часткі ва неўстаноўленых месцах або на забараняльны сігнал святлафора, раптоўны выхад на праезную частку, гульня ў непасрэднай блізкасці ад дарогі. «Акрамя таго, далёка не ўсе юныя ўладальнікі ровараў спешваюцца пры пераходзе дарогі. Сур'ёзнай праблемай застаецца выкарыстанне гаджэтаў на хаду: навушнікаў, пагружэнне ў экран мабільнага тэлефона пры пераходзе праезнай часткі, а нярэдка і пры руху на ровары ці самакаце. У такіх умовах падлеткі не могуць адэкватна ацаніць дарожную абстаноўку, што нярэдка цягне трагічныя наступствы», — дадаў старшы інспектар.

ДАІ, у сваю чаргу, правядзе прафілактычныя акцыі для дзяцей і бацькоў, а таксама рэйдавыя мерапрыемствы па спыненні парушэнняў правілаў дарожнага руху. Асаблівую ўвагу ўдзеляць выкананню кіроўцамі хуткаснага рэжыму, правілаў праезду пешаходнага пераxода і бяспечнай перавозкі дзяцей. ДАІ заклікае быць як мага больш уважлівымі пры руху паблізу дзіцячых устаноў, праездзе праз нерэгуляваныя пешаходныя пераходы, паблізу прыпынкаў грамадскага транспарту і асабліва на дваровай тэрыторыі.

«Не варта забываць пра бяспеку на чыгуначным транспарце. Толькі ў гэтым годзе зарэгістраваны тры выпадкі траўміравання дзяцей на чыгунцы. Прыкладна тыдзень таму дзесяцігадовая дзяўчынка здымала на мабільны тэлефон відэа і не ўбачыла электрацягнік, які набліжаўся, у выніку чаго атрымала траўмы, несумяшчальныя з жыццём», — паведаміў Васіль Дземідовіч.

## ДЗЕ НЕ МЕСЦА ДЛЯ ГУЛЬНЯЎ?

Летам у дзяцей з'яўляецца больш вольнага часу, яны часцей знаходзяцца на вуліцы і нярэдка застаюцца без нагляду дарослых. «Усё гэта прыводзіць да росту траўматызму і колькасці трагічных здарэнняў. Таму мы звяртаемся да бацькоў: кантралюйце дзяцей, не пакідайце без нагляду, асабліва малых. Падлеткам нагадвайце аб правілах паводзін на вадзе, небяспецы купання, ныранні. Сёлета ўжо адзначана некалькі фактаў, калі дзеці танулі», — дадаў старшы інспектар.

«Падлеткам уласцівае імкненне бавіць час у незвычайных і небяспечных месцах, адсюль нярэдкія здарэнні на закінутых, безгаспадарных будынках. Менавіта адсутнасць кантролю з боку дарослых прыцягвае шукальнікаў прыгод у такія месцы. Трэба папярэджваць іх, што будоўля, закінуты будынак — не месца для гульняў, бо тыя могуць у любы момант абрынуцца і траўміраваць», — падкрэсліў Васіль Дземідовіч.

Старшы інспектар звярнуў увагу таксама на наступную акалічнасць: з надыходам вясенне-летняга перыяду штогод рэгіструюцца няшчасныя выпадкі, звязаныя з падзеннем дзяцей з вокнаў. «Малы ўспрымае маскітную сетку як перашкоду, свабодна абапіраецца на яе і ў выніку адбываецца няшчасны выпадак. Таму не грэбуйце сродкамі засцярогі на вокнах — іх трэба абсталяваць адмысловымі блакавальнымі прыладамі. Адкрываючы вокны на праветрыванне, неабходна пераканацца, што дзіця знаходзіцца пад наглядам. Увогуле лепш не паказваць, як адчыняюцца вокны, а таксама не ставіць побач з імі мэблю, каб не спрашчаць малому задачу апынуцца на падаконніку», — звярнуў увагу старшы інспектар.

## ДАПАМОГА ПОБАЧ!

**Прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ** паведаміў, што з пачатку года падраздзяленні МНС выратавалі 21 дзіця, у тым ліку пяць — на пажарах. Астатнія сітуацыі звязаныя з захрасаннем рук і ног у радыятарах ацяплення, пральных машынах, фантанах, а таксама выпадкамі, калі дзеці залазяць на дрэвы, а потым не могуць адтуль спусціцца.

— Адказнасць у падобных выпадках ляжыць, зразумела, на дарослых. Менавіта таму цяпер самы лепшы час пагаварыць з дзецьмі пра бяспеку, — падкрэсліў Віталь Навіцкі. — Калі, напрыклад, вы вырашылі адправіць дзіця да бабулі ў вёску, то трэба нагадаць пра небяспеку адпачынку на вадзе, знаходжання ў лесе. Пакажыце дзіцяці мабільную праграму «МНС Беларусі: дапамога побач» з тэстамі, а таксама мультсерыял «Чароўная кніга».

Па словах прэс-сакратара, работнікі МНС ужо наведалі ўсе аздараўленчыя лагеры да пачатку іх работы. «Пад нашым асаблівым кантролем — спраўнасць сістэм пажарнай аўтаматыкі і аснашчанасць першаснымі сродкамі пажаратушэння, а таксама навучанне персаналу дзеянням у выпадку ўзнікнення той ці іншай надзвычайнай сітуацыі. Усе навучаныя ведаюць, што рабіць і як дзейнічаць, каб такія сітуацыі не адбываліся», — запэўніў ён.

> **БУДЗЬ У КУРСЕ!**
>
> Плануецца, што гэтым летам дзяцей на аздараўленне ў Беларусі будуць прымаць 5,6 тысячы лагераў, з іх 1,4 тысячы кругласутачных. Усяго плануецца арганізаваны адпачынак 342 тысяч навучэнцаў, з якіх 197,6 тысячы будуць праходзіць аздараўленне ў лагерах з дзённым знаходжаннем і 144,4 тысячы — з кругласутачным.

## НОВЫЯ КРЫНІЦЫ НЕБЯСПЕКІ

**Намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Кірыл КРЫВАРОТ** паведаміў, што ўсяго за 2020 год па краіне былі зарэгістраваны 145 704 першасныя звароты дзяцей і падлеткаў ва ўзросце да 17 гадоў уключна з траўмамі рознай лакалізацыі.

«Самы траўманебяспечны ўзрост — 10–13 гадоў (44 948 траўмаў), на другім месцы ўзроставая група ад 5 да 9 гадоў (37 152 траўмы) і на трэцім — 15–17 гадоў (25 471 траўма). Сярод траўмаў пераважаюць бытавыя (54,4 %), на другім месцы — вулічныя (34,6 %), на трэцім — спартыўныя (5,7 %), далей — школьныя (2,2 %), транспартныя (0,4 %) і іншыя. На першым месцы па частаце — траўмы канечнасцяў (74,7 %): удары, вывіхі, расцяжэнні і пераломы, на другім — пашкоджанні галавы і шыі (12,3 %)», — паведаміў спецыяліст.

Кірыл Крываротзаўважыў, што апошнім часам з'явіліся і ўчасціліся новыя віды траўмаў, атрыманыя пры скачках на батуце, катанні на цюбінгах і іншых сродках індывідуальнай мабільнасці (веласіпедах, роліках, скейтбордах, электрасамакатах, электраскутарах, манаколах). Так, за 2020 год пацярпелі ад скачкоў на батуце 499 чалавек. Падчас катання на цюбінгах і санках былі атрыманы 414 траўмаў, на ровары — 2083, роліках і скейтбордах — 820, электрасамакатах і электраскутарах — 360. І 39 дзяцей былі траўміраваны падчас катання на манаколе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Экспертыза

# САБАКІ-ДЭТЭКТАРЫ

## Як сябры нашы меншыя дапамагаюць вызначаць злачынцаў?

**Аб жудасным забойстве, здзейсненым у верасні 2003 года, доўгі час гаварылі жыхары маленькага Іўя, што на Гродзеншчыне. У калодзежы аднаго з прыватных падвор'яў было знойдзена цела 70-гадовай гаспадыні дома. Следчыя адразу ўстанавілі: на няшчасны выпадак гэта непадобна. Аднак па гарачых слядах адшукаць злачынцу не атрымалася, і доўгія амаль 18 гадоў асабліва цяжкае злачынства заставалася нераскрытым...**

Неверагодна, але дапамаглі расследаваць даўняе забойства сабакі. Гэта стала магчымым дзякуючы ўкараненню спецыялістамі Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз новай методыкі. На фрагменце цэглы, знойдзенай на месцы злачынства 18 гадоў таму, быў выяўлены пах чалавека, які супаў з пахам 44-гадовага жыхара Іўя.

Каб на свае вочы ўбачыць, як сабакі дапамагаюць ідэнтыфікаваць рэчы падазраваных асоб і рэальных злачынцаў, карэспандэнт «Звязды» наведала адну з лабараторый Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.

### ПАЗНАЦЬ ЗЛОДЗЕЯ ПА ПАХУ

У эксперыменце задзейнічаны трое чатырохногіх. Рэквізіт — дзесяць шклянак з невялікім кавалачкам фланелевай тканіны ўнутры. На кожным фрагменце ўтрымліваецца пах адной з асоб, якую правяраюць. І толькі адзін супадае са стартавай пробай, якую даюць панюхаць сабакам у пачатку эксперымента. Задача жывёл — з дзесяці пазіцый выбраць адну, поўнасцю ідэнтычную стартавай пробе.

У лабараторыю сабак заводзяць па чарзе — для чысціні эксперымента. Нямецкая аўчарка занюхвае прапанаваную ёй пробу. Разам з экспертам яна ідзе па крузе, пранюхваючы кожную шклянку, арыентуючыся на пах, які адчувала ў самым пачатку. Раптам сабака сядае каля той пробы, якая з'яўляецца дакладнай копіяй стартавага ўзору. Жывёле дзякуюць, даюць ласунак і выводзяць з лабараторыі. Эксперымент завершаны — спецыялісты падводзяць вынікі.

Аднак бываюць сітуацыі, калі жывёлы па паху вызначаюць злачынцу, а ён да апошняга не прызнаецца ў здзейсненым. Ці могуць сабакі памыліцца?

— Каб выключыць верагоднасць памылкі, у методыку даследавання закладзена некалькі сістэм праверак, — гаворыць **старшы эксперт аддзела даследавання пахавых слядоў чалавека цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Аляксей РУБАН.** — Напрыклад, на этапе эксперымента спецыялісты выкарыстоўваюць эталонную пробу, якая дазваляе нам пераканацца ў працаздольнасці сабакі. Таксама мы прапануем жывёле панюхаць на старце пробу чалавека, які дакладна не мае дачынення да канкрэтнага злачынства: для таго каб выключыць наяўнасць пахавых перашкод на пробах, якія даследуюцца. Калі гэтага не зрабіць, сабака можа адрэагаваць на пах, які па пэўнай прычыне прыцягнуў яе ўвагу. Таму, каб выключыць верагоднасць ілжывай пасадкі, мы правяраем наяўнасць пахавых перашкод на аб'ектах, якія даследуюцца.



Дзеля дакладнасці ў даследаванні ўдзельнічае не менш за тры сабакі. Экспертызу праводзяць два эксперты. Адзін фарміруе пахавы рад, потым фіксуе ўсе вынікі даследавання. Другі эксперт водзіць жывёл. Гэта робіцца з мэтай прадухілення памылковых пасадак у чатырохногіх сяброў: той, хто вядзе сабак, можа чыста механічна аказаць на іх уздзеянне. Справа ў тым, што жывёла як біядэтэктар счытвае любую інфармацыю: адчувае сэрцабіццё, дыханне, пульс. Яна можа адшукаць патрэбную пробу толькі таму, што спецыяліст ведае, дзе яна знаходзіцца.

### УСЮДЫ СУНУЦЬ НОС

Вызначаць пах злодзея на знойдзеных на месцы злачынства аб'ектах чатырохногіх вучаць самі эксперты. Кожная парода сабак прызначана для пэўнай мэты: адны выкарыстоўваюцца ў пошуку злачынцаў, іншыя добра падыходзяць для аховы. Сабак, якія ўвогуле не паддаюцца навучанню, як лічаць спецыялісты, не існуе.

У аддзеле даследавання пахавых слядоў чалавека цэнтральнага апарату ДКСЭ служаць нямецкія і бельгійскія аўчаркі. Гэтыя сабакі ўраўнаважаныя, спакойныя, удумлівыя. Сюды яны трапляюць яшчэ шчанюкамі, якім усяго па паўгода. На працягу года іх вучаць станавіцца сабакамі-дэтэктарамі. За кожным сабакам замацаваны свой эксперт, які займаецца падрыхтоўкай жывёлы.

— Спачатку даём час сабаку асвоіцца ў лабараторыі, — расказвае Аляксей Рубан. — Як правіла, шчанюкі вельмі цікаўныя і праблем у навучанні з імі не ўзнікае: яны ўсюды сунуць свой нос. За кожны пранюх мы іх заахвочваем ласункам, хвалім: сабака ўжо разумее, што робіць нешта правільна. Для таго каб жывёла навучылася хадзіць па радзе, спачатку кладзём у шклянкі ежу: сухі корм або кавалак сыру. Калі яна ўжо ўмее пранюхваць шклянкі, мы пачынаем задаваць ёй моцны пах на старце — такі ж самы будзе ў адной са шклянак у даследаваным радзе.

Трэніроўкі з сабакамі-дэтэктарамі праводзяцца кожны дзень, часта — па некалькі разоў. Важна не перагрузіць гадаванцаў і не адбіць жаданне працаваць. Пад апекай Аляксея Рубана двое чатырохногіх сяброў — Герда і Норд. Ён не толькі іх вучыць, але і прагульваецца з сабакамі, удзельнічае ў іх доглядзе. Цікава, што ў лабараторыі вадзіць жывёл можа любы судовы эксперт: сабакі ведаюць, як сябе паводзіць, і разумеюць, што ад іх хочуць. А вось ужо на вуліцы, падчас прагулкі, яны слухаюць толькі свайго гаспадара.

### ПРЫБОРА НЕ ПРЫДУМАЛІ

— Малекулы паху валодаюць здольнасцю выветрывання і рассейвання, — адзначае старшы эксперт аддзела даследавання пахавых слядоў чалавека. — Аднак на крыві, якая ўжо высахла, гэтыя малекулы могуць захоўвацца доўгія гады.

У сувязі з гэтым на судовую экспертызу пахавых слядоў чалавека ў цэнтральны апарат Дзяржкамітэта судовых экспертыз пачалі дасылаць матэрыялы нераскрытых крымінальных спраў мінулых гадоў. У некаторых выпадках, калі іншыя віды даследаванняў не далі станоўчага выніку, праваахоўнікі разлічваюць толькі на сабак-дэтэктараў.

Апошнія, напрыклад, пралілі святло на крымінальную справу, фігурантамі якой выступалі родныя браты, якія скралі аўтамабіль. Адзін быў за рулём, другі сядзеў на пярэднім пасажырскім сядзенні. Пад падазрэнне трапілі абодва. На экспертызу прыйшлі чахлы з сядзенняў аўтамабіляў і кроў юнакоў. Атрымалі пахавыя пробы, правялі экспертызу. Высветлілася, што сядзеў за рулём малодшы з братоў, непаўналетні, — менавіта па гэтай прычыне старэйшы браў усю віну на сябе.

Цікавы факт: нават сярод родных людзей жывёлы могуць вызначыць, каму канкрэтна належыць біялагічны матэрыял. Калі ў аднаяйцавых блізнят генатып аднолькавы, то пах адрозніваецца — сабакі-дэтэктары з лёгкасцю ідэнтыфікуюць іх рэчы. Кроў з'яўляецца найбольш чыстай крыніцай індывідуальнага паху чалавека. Прыбора, які б з высокай дакладнасцю аналізаваў бы яго, яшчэ не прыдумалі. Лепш за сабак з дадзенай задачай справіцца пакуль ніхто не можа.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота дадзена Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз.**

На слыху

# Людзі не пацярпелі, коней выратавалі

## Учора гарэла стайня Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі ў Ратамцы

**У прыёмнай генеральнага дырэктара ўстановы карэспандэнту «Звязды» паведамілі, што пажар пачаўся прыблізна а палове першай гадзіны дня. Усіх коней вывелі і выратавалі, у тым ліку дзякуючы выпадковым людзям, што апынуліся паблізу.**

Як расказала **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Дзіяна ЖАЛЯЗНЯК,** паведамленне аб узгаранні стайні ў цэнтр аператыўнага кіравання Мінскага раёна паступіла ў 12.44. «На месца неадкладна выехалі падраздзяленні МНС, — адзначылі ў ведамстве. — У час прыбыцця ратавальнікаў да месца надзвычайнага здарэння будынак стайні гарэў адкрытым полымем. У 13.11 пажар быў лакалізаваны, а ў 13.30 ратавальнікі канчаткова ліквідавалі надзвычайную сітуацыю. У выніку пажару агнём знішчаны дах стайні на плошчы 1300 квадратных метраў. Прычына ўзгарання ўстанаўліваецца».

Да прыбыцця падраздзяленняў МНС работнікамі цэнтра са стайні былі эвакуіраваны 44 кані. У выніку пажару ні жывёлы, ні людзі не пацярпелі.



Telegram-канал Следчага камітэта Беларусі дадае, што ўстаноўлена: конюх па ўласнай ініцыятыве выконваў работы з дапамогай балгаркі. Іскра трапіла на сена. Ад распаўсюджвання агню, па папярэдняй версіі, і адбылося ўзгаранне даху стайні. Следча-аператыўнай групай у другой палове дня фіксавалася следавая карціна, адбіралася неабходная дакументацыя. Прызначаны неабходныя экспертныя даследаванні для ўстанаўлення ўсіх абставін таго, што адбылося.

**Фота дадзена МНС.**